Церуха – калыска майго дзяцінства

Шылец Кацярына,
дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цярухская сярэдняя школа”
Гомельскага раёна,
5 клас

*Вось так яно часам бывае,*
*Што мы ў сумятлівым жыцці*
*Мінаем і не заўважаем*
*Красу сваіх родных мясцін.*

Кожны чалавек непасрэдна звязаны з той зямлёю, на якой нарадзіўся.

І ў якім бы кутку мы ні апынуліся, усюды ўбачым нямала цудоўных мясцін, якія надоўга пакідаюць светлы след у памяці.

Мой родны кут – Церуха. Мне здаецца, што гэта самы прыгожы і прывабны куточак нашай зямлі. Тут, на гэтай зямлі, дзе чуваць нетаропкі голас рэчкі Церухі, што бліскучай стужкай мінае вёску, дзе перапляліся ў чароўных карунках танклявыя бярозы, сціплыя вольхі і высокія сосны, праходзіць маё дзяцінства. Тут нарадзілася мая маці, бабуля і прабабуля. Тут жывуць мае сябры, родныя і блізкія людзі.

Прыязджайце да нас у вёсачку. Па сучасных мерках, з Гомеля да Церухі рукой падаць, крыху больш за дваццаць кіламетраў. Да нас з горада вядуць дзве дарогі: чыгунка (да прыпынку Церуха) і старэйшы шлях у Беларусі Пецярбург-Кіеў, які бясконцай стужкай цягнецца на поўдзень. Калісьці, даўно, праз Церуху праходзіў найстаражытны Кацярынінскі шлях. І сама Кацярына II праязджала праз Церуху на адпачынак у Адэсу.

Мільгаюць за вокнамі аўтобуса ў пышным зялёным убранні жытнёвыя палі, лугі. Ідзе шлях, мінаючы знаёмыя назвы вёсак – Калініна, Арленск, Асавіно. Пад’язджаем да вёскі Церуха. Паваротка направа. На ўскрайку дарогі апавітая зелянінаю вёска. На шыльдзе пазначана: “Церуха”. Адразу ўспамінаюцца цудоўныя вершаваныя радкі:

Не знайсці мне шчасця на чужыне,
Бо яго там для мяне няма.
Даражэй замор’я мне радзіма,-
Мілая, чароўная зямля.

Роднай вёскі хаты пры дарозе,
А вакол зялёныя палі,
І буслянка на старой бярозе,
І над ёй у небе два буслы.

Мы ў Церусе. Звычайны летні дзень. Паветра такое чыстае, здаецца, ніколі яго не нап’ешся ўдосталь. Каля плота на лаўках сядзяць старыя, побач гуляюць дзеці. Аднекуль здалёк далятаюць прыглушаныя гукі песень.

Побач з вёскай – брацкае пахаванне: ушанаванне памяці 427 воінаў 37 стралковай дывізіі, што склалі адважныя галовы ў верасні 1943 года ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вырас тут у 1959 годзе сціплы абеліск. Учытаемся ў імёны вайскоўцаў. Сярод іх герой Савецкага Саюза А.Д.Валогін. Менавіта ў яго гонар названа цэнтральная вуліца вёскі.

Паволі крочым па вуліцы. Злева двухпавярховы будынак. Гэта мая школа, якая ў любую пару года гасцінна адчыняе ўсім дзверы. Са школьнага стадыёна чуецца рознагалосая говорка, звонкі смех: хлапчукі з вуліц Шамякіна і Валогіна наладзілі паміж собою футбольны матч. Сабралася шмат балельшчыкаў. Па праўдзе кажучы, мне хочацца, каб перамагла каманда з вуліцы Шамякіна. На гэтай новай вуліцы, названай у гонар вядомага беларускага пісьменніка І.Шамякіна, у спецыяльна пабудаваных для нас доміках і жыву я са сваімі бацькамі. Летам вуліца нібы не мае агароджаў: суцэльныя кусты парэчак, у зялёнай лістоце якіх ззяюць-зіхацяць чорныя, пунсова-чырвоныя, залаціста-жоўтыя ягады. Тут, у Церусе, чамусьці любяць асабліва смароду. У пацверджанне гэтаму адразу хочацца прыгадаць словы І.Мядзведзева, карэннага жыхара вёскі:

За Церухой смароды пах,
Гусцеюць цені ад ляшчыны.
Ляціць за сад, за гай, за шлях
Бесперапынны шум плаціны.

Немагчыма стрымацца ад спакусы, каб не сарваць спелую ягадзіну і пакласці ў рот. І раптам голас мамы: “Каця! Ізноў у парэчках сядзіш?”

Кажуць, што ўспаміны дзяцінства самыя яскравыя. Яны адбіваюцца ў нашай памяці назаўсёды. Таму, напэўна, я добра запомню бярозавы гай, што раскінуўся за рэчкай, з боку вёскі. Ён вабіць шолахам лісточкаў, водарам траў, спевам птушак. Я вельмі люблю блукаць па бярозавым гаі, ляску, што пачынаецца адразу за гаем і сваім крылом як бы закрывае прыгожую вёску ад вятроў і розных нягод.

А каго ў летні час не кліча да сябе рэчка? Неабсяжная сінь высокага неба. Цёплая, пяшчотная вада лагодна падкочваецца да берага – я і мае сябры збіраемся і гуртам з крыкам і гоманам бяжым да ракі. Жоўты пясочак на беразе, зялёная траўка на лузе. Прыемна прабегчыся па пясочку, па мяккай траве.

Менавіта таму прыгажосць ваколіц Церухі на ўсё жыццё ўвайшла ў сэрца народнага пісьменніка Беларусі І.П.Шамякіна. У 1951 годзе на грошы Сталінскай прэміі за раман “Глыбокая плынь”, у якім пазнаецца згаданая мясцовасць, І.Шамякін пабудаваў у Церусе звычайную вясковую хату, куды пастаянна прыязджаў з сям’ёю на лета прыкладна да сярэдзіны 1960-х г.г. Гэта самы шчаслівы перыяд у яго жыцці. Тут, менавіта ў Церусе, напісаны раманы “У добры час”, “Крыніцы”, “Трывожнае шчасце”, “Сэрца на далоні” (назвы якія!). Сюды пастаянна наведваліся госці – калегі-пісьменнікі. Некаторыя – Андрэй Макаёнак, Аляксей Кулакоўскі – проста прыязджалі пажыць.

Дача Шамякіна захавалася да сённяшняга часу, але, на жаль, належыць іншым людзямі і зараз выглядае інакш. Ваколіца вёскі Церуха яшчэ і зона мясцовага значэння на тэрыторыі Гомельскай вобласці.

І гэта ўсё мая Церуха – любімая мясціна дзяцінства.